**ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КПСС ВЫКАЗВАЕ ЎПЭЎНЕНАСЦЬ, ШТО НАША ВЫДАТНАЯ МОЛАДЗЬ З НОВАЙ СІЛАЙ ПАЦВЕРДЗІЦЬ СВАЮ ВЕРНАСЦЬ ЛЕНІНСКІМ ЗАПАВЕТАМ, СПРАВЕ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ, АЗНАМЯНУЕ ЧАЦВЁРТЫ ГОД ПЯЦІГОДКІ УДАРНАЙ ПРАЦАЙ І ВЫДАТНАЙ ВУЧОБАЙ. РАДЗІМА ВЕРЫЦЬ У МАЛАДОЕ ПАКАЛЕННЕ, У ЯГО ПРАЦАВІТАСЦЬ, НАСТОЙЛІВАСЦЬ І САМААДДАНАСЦЬ!**

**(Са Звароту Цэнтральнага Камітэта КПСС да партыі, да савецкага народа).**

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 1 (1037) ● ЧАЦВЕР, 10 студзеня 1974 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выдаецца з 1935 г.

## АДКАЖАМ ВЫДАТНАЙ ВУЧОБАЙ

**У гэтыя дні камсамольцы і моладзь універсітэта, як і ўвесь савецкі народ, абмяркоўваюць Зварот Цэнтральнага Камітэта КПСС да партыі, да савецкага народа. Ён выклікае творчы ўздым, імкненне вучыцца яшчэ лепш, каб стаць высокакваліфікаванымі спецыялістамі і прынесці як мага больш карысці сваёй Радзіме.**

Камсамольцы універсітэта горача адклікнуліся на пастанову бюро ЦК ВЛКСМ правесці 8—12 студзеня 1974 года Усесаюзны камсамольскі сход «Ударнай працай і выдатнай вучобай адзначым вызначальны год пяцігодкі».

Адбылася нарада сакратароў факультэцкіх камсамольскіх арганізацый, на якой складзен графік правядзення сходаў.

Зараз ва універсітэце ў разгары зімовая сесія. На сход многія хлопцы і дзяўчаты прыйдуць адразу пасля экзаменаў, каб абмеркаваць задачы сваёй пярвічнай арганізацыі, крытычна ацаніць недахопы, павесці дзелавую, сур'ёзную размову.

**Л. ЖАЛУДКОЎ,**
**інструктар камітэта камсамола.**

Гэта сесія — першая ў нашым жыцці. Але не толькі таму мы так хвалюемся. Мы, студэнты, адчуваем асаблівую адказнасць, бо да нас. як і да ўсяго савецкага народа, звернуты словы Звароту ЦК КПСС.

Па выніках сацыялістычнага спаборніцтва мінулага года наш факультэт заняў III месца. Але мы не спынімся на дасягнутым.

Шчыра абяцаем, што першакурснікі ў сесію не падвядуць!

**Н. ЗАІКІНА,**
**студэнтка I курса юрыдычнага факультэта.**

## УРАЧЫСТЫ СХОД

Напярэдадні новага года прафесары, выкладчыкі і супрацоўнікі універсітэта сабраліся на урачысты сход, каб падвесці вынікі сацыялістычнага спаборніцтва.

На трыбуне рэктар універсітэта прафесар У. М. Сікорскі. Ён гаворыць аб дасягнутых поспехах, называе перадавыя факультэты: філалагічны, фізічны, юрыдычны і гістарычны.

За год выканана 133 планавыя навуковыя тэмы, 31 з іх укаранёна ў вытворчасць. Гаспадарчых дагавораў усяго па універсітэту выканана на суму 2 млн. 830 тысяч рублёў.

Каля 500 студэнцкіх работ было прадстаўлена на I тур V Усесаюзнага конкурсу па праблемах грамадскіх навук, 452 — апублікаваны.

Ва універсітэце вялася вялікая палітыка-выхаваўчая работа, многае зроблена па расшырэнню матэрыяльнай базы.

Але перад нашай вну стаяць яшчэ вялікія і адказныя задачы. Галоўная — рашучае паляпшэнне вучэбнай работы, а таксама стварэнне добрых творчых калектываў, якія дазволяць пазбавіцца ад дробнатэм'я ў навуковай рабоце.

У адпаведнасці з палажэннем аб сацыялістычным спаборніцтве камісія падвяла вынікі і вызначыла пераможцаў. Першае месца заняў філалагічны факультэт. Ён узнагароджан пераходным Чырвоным сцягам і Ганаровай граматай універсітэта.

Другое месца заняў фізічны факультэт, трэцяе раздзялілі гістарычны і юрыдычны факультэты. Камісія прызнала лепшымі кафедру гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў і вучэбны аддзел. Лепшыя вучэбныя групы — першая IV курса фізічнага факультэта і V курс аддзялення філасофіі гістарычнага факультэта.

Каля 90 выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта узнагароджаны знакам «Выдатнік сацыялістычнага спаборніцтва».

## ПРАВЕРКА ЯКАСЦІ

Яркім паказчыкам работы студэнтаў на працягу семестра з'яўляецца экзаменацыйная сесія.







Клопатамі сесіі насычана нават паветра універсітэцкага гарадка. Усе думкі, увесь час, распарадак жыцця ўзяла ў свае рукі гаспадыня-сесія.

Першы курс, першы экзамен — вышэйшая алгебра. На рубяжы выпрабавання — будучыя матэматыкі. А экзаменуе іх дацэнт Рэгіна Іосіфаўна Тышкевіч.

Фота **Д. Чаховіча.**

Менавіта на аснове яе вынікаў можна меркаваць аб стане не толькі вучэбнай, але і ўсёй выхаваўчай работы ў групе, на курсе, на факультэце ў цэлым. Сесія таксама красамоўна гаворыць і аб эфектыўнасці работы камсамольскай арганізацыі на працягу семестра, узаемадзеянні ўсіх яе звенняў і спалучэнні розных форм вучэбна-выхаваўчага працэсу. Па сутнасці падрыхтоўка да яе павінна пачынацца з першых дзён вучобы. Менавіта ад таго, наколькі сур'ёзна адносяцца камсамольцы да сваіх абавязкаў—а вучоба з'яўляецца важнейшай справай, — залежыць і далейшы іх рост як будучых спецыялістаў. Рашаючая роля тут належыць камітэтам камсамола факультэтаў, іх акадэмічным сектарам. Накіраванасць, непрымірымасць да прагульшчыкаў, дапамога адстаючым, галоснасць у рабоце — гэтыя і іншыя формы барацьбы за павышэнне паспяховасці зробяць уплыў на вынікі.

Заслугоўвае ўвагі работа акадэмічнага сектара камітэта камсамола філалагічнага факультэта. Там у групах стварылі акадэмічныя камісіі з ліку лепшых студэнтаў і камсамольскіх актывістаў. Студэнты, якія маюць запазычанасць па семінарах або прапускаюць заняткі без уважлівых прычын, трымаюць адказ перад сваімі таварышамі. І тут значна паменшыліся пропускі заняткаў, студэнты лепш рыхтуюцца да практычных.

Вельмі цікавы эксперымент здзейсніў камітэт камсамола фізічнага факультэта. Пярвічныя камсамольскія арганізацыі створаны не ў вучэбных групах, а па кафедрах, незалежна ад курса. Ужо бягучае падвядзенне вынікаў паказала, што паспяховасць студэнтаў, аб'яднаных агульнымі інтарэсамі па спецыялізацыі, стала значна вышэй.

Камітэтам камсамола факультэтаў належала б пераняць вопыт і іншых вну рэспублікі, напрыклад, БПІ, дзе створаны грамадскія дэканаты на факультэтах. Яны адчувальна дапамагаюць адміністрацыі ў рашэнні ўсіх вучэбных спраў.

Вялікае значэнне (а ў перыяд падрыхтоўкі да сесіі, можа, і рашаючае) мае ўздзеянне камсамольскай арганізацыі на правільнае размеркаванне рабочага часу, бо тут часта можна назіраць крайнасці: то сканцэнтраванасць толькі на вучобе, зняважлівыя адносіны да грамадскага і духоўнага жыцця, або распыленасць.

Камітэтам камсамола, акадэмічным сектарам неабходна звярнуць самую сур'ёзную ўвагу на гэту праблему. Вялікую дапамогу павінен аказаць савет выдатнікаў універсітэта, таму што бюджэт часу студэнта, які выдатна паспявае ў вучобе і актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці, прадстаўляе значную цікавасць.

Добра робяць акадэмічныя сектары, якія ў перыяд падрыхтоўкі да сесіі вялікую ўвагу ўдзяляюць першакурснікам. Вядома, самым малодшым часам цяжка без дапамогі правільна размеркаваць свае сілы, выбраць найбольш аптымальны варыянт падрыхтоўчай работы. На факультэтах ужо традыцыйнымі сталі сустрэчы студэнтаў I курса са старшакурснікамі. Гэта выпрабаваны прыём, які дае свае станоўчыя вынікі. Эфектыўнымі з'яўляюцца і іншыя формы— камсамольскія сходы ў групах, арганізацыя вучэбна - кансультацыйных пунктаў, сустрэчы з выкладчыкамі і г. д.

Акадэмсектары сумесна са студсаветамі напярэдадні сесіі правяраюць стан чытальных залаў у інтэрнатах, замацоўваюць за ўсімі групамі адказных з ліку факультэцкага актыву.

У перыяд сесіі ўзрастае роля такой формы камсамольскай работы, як галоснасць. На факультэтах журналістыкі, геаграфічным і некаторых іншых вывешваюцца экраны паспяховасці, дзе адлюстроўваецца індывідуальны ход здачы экзаменаў, лісткі-маланкі, дыяграмы паспяховасці па курсах.

Чарговая сесія ўступіла ў свае правы. Асноўная задача камітэтаў камсамола і акадэмічных сектараў, камсамольскіх бюро груп у тым, каб мабілізаваць усіх студэнтаў на актыўную і мэтанакіраваную работу. Кожная выдатная адзнака — гэта сведчанне якасці падрыхтоўкі будучага спецыяліста.

**Р. ЯНЧЫЛІК,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола БДУ па вучэбнай і навуковай рабоце.**

## ВІНШУЕМ З ЮБІЛЕЕМ!

Грамадскасць універсітэта адзначыла 50-гадовы юбілей мастацкага кіраўніка народнага ансамбля танца «Крыжачок» М. В. Лапшы.

За плённую работу ў якасці кіраўніка і балетмайстра - пастаноўшчыка ансамбля рэктарат, партком, мясцком і прафком універсітэта ўзнагародзілі М. В. Лапшу Ганаровай граматай і памятнымі сувенірамі. Мікалай Вікенцьевіч узнагароджан таксама граматамі абкома прафсаюза і аблсаўпрофа.

# СТАРОНКА НАРОДНАГА КАНТРОЛЮ № 8



# ДАВЕР'Е АБАВЯЗВАЕ

## СА СПРАВАЗДАЧЫ СТАРШЫНІ ГНК УНІВЕРСІТЭТА Я. М. ТАГУНОВА

**У снежні 1973 года ва універсітэце праходзілі справаздачы і выбары груп і пастоў народнага кантролю. Адбылося пяць сходаў (у АГЧ, выдавецтве, у вучэбна-доследнай гаспадарцы «Шчамысліца», інстытуце павышэння кваліфікацыі і на ваеннай кафедры) і 13 канферэнцый (на факультэтах і агульнауніверсітэцкая), на якіх прысутнічала каля 1.200 чалавек. У спрэчках па справаздачных дакладах выступіла 85 чалавек.**

**У 17 груп і пастоў народнага кантролю выбрана 250 чалавек, у тым ліку 90 камуністаў, 73 члены ВЛКСМ, 79 жанчын, 67 студэнтаў і 183 выкладчыкі і супрацоўнікі універсітэта.**

У ЧАС справаздачна-выбарнай кампаніі адбылася дзелавая і прынцыповая размова аб рабоце народных кантралёраў на факультэтах, у АГЧ, выдавецтве і друкарні, на ваеннай кафедры і ў іншых падраздзяленнях. У справаздачах груп і ў выступленнях удзельнікаў канферэнцый і сходаў былі разгледжаны асноўныя напрамкі работы, прааналізавана дзейнасць сектараў і асобных кантралёраў, ускрыты недахопы. Кантралёрам дадзены наказы, якія будуць пакладзены ў аснову работы ўноў выбраных груп.

Універсітэцкая група, у якой працавалі ў якасці кантралёраў 23 выкладчыкі, 14 супрацоўнікаў і 8 студэнтаў, у сваёй практычнай дзейнасці кіравалася «Палажэннем аб органах народнага кантролю СССР» і імкнулася рэалізаваць тыя крытычныя заўвагі, што былі выказаны на папярэдняй універсітэцкай канферэнцыі. Заўвагі былі ўлічаны пры планаванні работы групы. Паменшылася колькасць праверак, але яны сталі больш глыбокімі, грунтоўнымі. Шэраг праверак зроблен сумесна з факультэцкімі групамі.

Падтрымліваўся пастаянны кантакт з мясцкомам, прафсаюзнымі арганізацыямі, штабам «Камсамольскага пражэктара». Неаднаразова важныя пытанні па прапанове ГНК выносіліся на разгляд парткома і рэктарата.

Універсітэцкая ГНК працавала пад непасрэдным кіраўніцтвам партыйнага камітэта, які на сваіх пасяджэннях разглядаў планы работы ГНК, даваў канкрэтныя заданні, прыцягваў да разбору заяў і скарг, якія паступалі ў партыйны камітэт. Абмеркаванне работы ГНК у партыйным камітэце дапамагала сканцэнтравацца на галоўных, вузлавых пытаннях.

У рабоце групы прытрымліваліся прынцыпу галоснасці. Матэрыялы народнага кантролю публікаваліся ва універсітэцкай шматтыражнай газеце ў выглядзе тэматычных старонак, падборак, змяшчаліся асобныя артыкулы.

Перыядычна інфармацыя ГНК з'яўлялася на стэндзе ў галоўным корпусе і прыцягвала ўвагу калектыву да тых пытанняў, якімі займаліся народныя кантралёры.

Уся работа універсітэцкай ГНК падраздзялялася на два вялікія ўчасткі: здзяйсненне кантролю ў маштабе ўсяго універсітэта; кіраўніцтва работай 16 груп ва ўсіх падраздзяленнях БДУ.

У ГНК было створана шэсць сектараў. Вучэбны, пад кіраўніцтвам дацэнта фізфака А. Д. Андрэева, правёў 15 праверак, якія ахоплівалі найбольш важныя ўчасткі вучэбнай работы. Вялікую ўвагу сектар удзяліў планаванню заняткаў студэнтаў на ўсіх факультэтах, вучэбнай нагрузцы прафесарска-выкладчыцкага саставу. У ходзе праверак высветлілася, што на фізічным, хімічным і некаторых іншых факультэтах абавязковыя заняткі плануюцца звыш устаноўленага максімуму; нераўнамерна размяркоўваецца нагрузка выкладчыкам. ГНК унесла адпаведныя рэкамендацыі ў вучэбны аддзел і дэканаты. Праведзеная ў лістападзе мінулага года праверка паказала, што значная частка ўскрытых недахопаў ліквідавана.

ГНК паставіла перад рэктаратам пытанне аб мэтазгоднасці стварэння лабараторыі планавання навучальнага працэсу з прымяненнем ЭВМ.

Была дасканальна праверана і прааналізавана работа матэматычнага факультэта. У выніку рэкамендавана было, каб палепшыць паспяховасць і іншыя паказчыкі работы, перавесці заняткі на факультэце ў першую змену. І гэта мера аказалася карыснай.

Сектар праверыў таксама работу падрыхтоўчага аддзялення, падрыхтаванасць кафедр замежных моў да работы з абсталяваннем лінгафонных кабінетаў і інш.

Работа сектара звязвалася з дзейнасцю савета НАП і савета па навуковай арганізацыі навучальнага працэсу.

Сектар навуковай работы займаўся выкарыстаннем каштоўнага абсталявання і матэрыялаў на кафедрах фізічнага, хімічнага, біялагічнага і геаграфічнага факультэтаў, а таксама захаваннем матэрыялаў і абсталявання ў аддзеле капітальнага будаўніцтва БДУ. Кантралёры настойліва дабіваліся, каб выяўленыя недахопы былі ліквідаваны, і атрымалі станоўчы вынік.

Сур'ёзныя заўвагі былі выказаны кантралёрамі пры абмеркаванні работы выдавецтва БДУ па выкананню тэматычнага плана выдання літаратуры 1972 г. і падрыхтоўкі плана 1973 года. Крытыкавалася дзейнасць асобных кафедр. Каб выправіць становішча, рэктарат стварыў рэдакцыйна-выдавецкі савет, аднак працуе ён не вельмі інтэнсіўна. Праявілі цікавасць кантралёры і да таго, як выконвае выдавецтва план падрыхтоўкі да выпуску падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў. Вынікі праверкі былі заслуханы на пасяджэнні парткома.

Сектар быту пастаянна трымаў у полі зроку работу буфетаў і сталовых ва ўсіх вучэбных карпусах і інтэрнатах. Праверкі праводзіліся сумесна з мясцкомам і прафкомам, штабам «КП». Многія недахопы былі ліквідаваны адразу, па іншых давялося звяртацца ў адпаведныя ўстановы. Аднак і зараз нельга сказаць, што харчаванне студэнтаў і супрацоўнікаў БДУ наладжана добра. Неабходна як мага хутчэй адкрыць сталовую ў галоўным корпусе, у геаграфічным і юрыдычным стварыць хоць невялікія буфеты. Да пытанняў харчавання трэба адносіцца так, як на прамысловых прадпрыемствах, дзе сталовыя лічацца цэхам № 1, бо ад іх работы залежаць здароўе, настрой людзей, прадукцыйнасць працы.

У інтэрнатах прымаліся меры, каб стварыць належныя санітарна-гігіенічныя абставіны ў жылых і службовых памяшканнях, палепшыць забяспечанасць інвентаром.

Сектар па ахове сацыялістычнай маёмасці (кіраўнік І. В. Галаваты) сачыў за тым, як зберагаюцца фота- і тэлевізійная апаратура на журфаку, фізфаку, юрфаку, пішучыя машынкі на кафедрах.

Двойчы праверана захаванасць інвентару, будынкаў інтэрнатаў. Трэба сказаць, што, нягледзячы на неаднаразовыя рэкамендацыі ГНК, да гэтай пары не па-гаспадарску расходуецца электраэнергія. Як у аўдыторыях, так і ў інтэрнатах нярэдка днём уключана асвятленне. І ў той жа час у некаторых аўдыторыях і інтэрнацкіх пакоях асвятленне ніжэй устаноўленых норм.

У дрэнным стане сантэхнічнае абсталяванне вучэбных карпусоў і інтэрнатаў. У выніку кожны дзень з няспраўных кранаў марна выцякае не адна тысяча літраў так патрэбнай гораду вады, за якую універсітэт павінен плаціць. На гэта не аднойчы была звернута ўвага адміністрацыйна - гаспадарчай часткі, аднак становішча не змянілася.

Выклікае трывогу і стан будынка інтэрната № 7, дзе душавыя пакоі абсталяваны не так, як трэба, і вада пастаянна працякае ў пакоі ніжніх паверхаў і псуе сцены. Каб зберагчы будынак, яго ўжо цяпер патрэбна рамантаваць.

Супрацоўнікам АГЧ патрэбна больш уважліва, з сапраўднай адказнасцю падыходзіць да прыёму ў эксплуатацыю універсітэцкіх збудаванняў.

У апошнія гады аснашчэнне вучэбных аўдыторый прыкметна палепшылася, аднак студэнты па-ранейшаму безадказна адносяцца да яго. Трэба павесці рашучую барацьбу з тымі, хто наносіць шкоду сацыялістычнай маёмасці.

Сектар скарг і заяў (кіраўнік — выкладчык юрфака В. А. Раманенка) цікавіўся арганізацыяй прыёму супрацоўнікаў, студэнтаў, наведвальнікаў у рэктарацe, дэканатах, агульнай канцылярыі. У свой час ГНК прапанавала наладзіць сістэматычную вытворчую вучобу супрацоўнікаў дэканатаў і агульнай канцылярыі, аднак у поўным аб'ёме наша рэкамендацыя пакуль не рэалізавана.

Усе скаргі, якія паступілі, былі разгледжаны ва ўстаноўлены тэрмін.

Сярод іншых асобае месца займае сектар арганізацыйна - масавай работы (кіраўнік — асістэнт хімфака А. А. Акінчыц). Ад яго работы залежыць поспех усёй ГНК. Сектар нядрэнна спраўляўся са сваімі абавязкамі. Была вывучана работа сямі груп народнага кантролю (хімфака, біяфака, матфака, ФПМ, гістфака, АХЧ, выдавецтва). Сектар правёў агляд сродкаў галоснасці ГНК і пастаянна клапаціўся аб галоснасці ўсёй кантралёрскай работы.

Гэты ж сектар займаўся пытаннямі вучобы народных кантралёраў.

Падводзячы вынікі, неабходна сказаць аб недахопах. Мы не дабіліся, каб кожны член ГНК меў пастаянны ўчастак работы і актыўна працаваў. Не выкарыстоўваліся такія формы, як рэйды, агляды, якія маглі б расшырыць кола кантралёраў. Не ва ўсіх выпадках ГНК праяўляла неабходную настойлівасць па рэалізацыі сваіх рэкамендацый. Недастаткова ўвагі было ўдзелена вучобе народных кантралёраў.

У АБМЕРКАВАННІ справаздачы прынялі ўдзел:

**Г. А. Браніцкі,** дэкан хімічнага факультэта. Універсітэцкая ГНК правяла ў справаздачным перыядзе вялікую і карысную работу. Але трэба сканцэнтравацца на пытаннях, якія чакаюць рашэння. Гэта перш за ўсё будаўніцтва складскіх памяшканняў. Яно вельмі зацягнулася, што перашкаджае нармальнаму набыццю і захаванню матэрыялаў і рэактываў. А гэта неспрыяльна адбіваецца на вучэбнай і навуковай рабоце.

З-за адсутнасці у корпусе хімфака прытокавай вентыляцыі тэмпература паветра не паднімаецца вышэй 13 градусаў, таму студэнты і выкладчыкі вымушаны працаваць у верхнім адзенні.

Па-ранейшаму патрабуе паляпшэння работа сталовых і буфетаў ва універсітэцкім гарадку і ў інтэрнатах.

Напэўна, эфектыўнасць работы ГНК была б большай, калі б вынікі праверак даводзіліся да кожнага, а вінаватых у недахопах каралі больш сур'ёзна.

**Н. Ф. Алькіна,** майстар наборнага цэха. Друкарня выдавецтва БДУ прызначана для выпуску кніжна-часопіснай прадукцыі. Аднак паліграфічная база друкарні знаходзіцца на вельмі нізкім узроўні. Асноўнае абсталяванне патрабуе замены, таму што на працягу многіх год капітальна не рамантавалася.

У цяперашні час у друкарні няма сучаснага абсталявання для маляўнічага афармлення прадукцыі. Адсутнасць неабходных рабочых плошчаў адмоўна ўплывае на вытворчую дзейнасць, умовы працы, захаванне тэхнікі бяспекі. Усё гэта тармозіць укараненне малой механізацыі вытворчых працэсаў. Таму многа ручной працы, у пераплётным цэху яна складае 90 працэнтаў.

Няўважлівыя адносіны да бытавых патрэб, забеспячэння жыллём супрацоўнікаў друкарні прыводзяць да цякучасці кадраў.

У 1972 годзе работу друкарні і выдавецтва правярала ГНК універсітэта. Былі выказаны канкрэтныя прапановы па павелічэнню вытворчых плошчаў, складскіх памяшканняў, забеспячэнню аўтатранспартам. У мінулым годзе аналагічную праверку правёў КНК рэспублікі, аднак становішча не змянілася.

**І. П. Зяцькоў,** дэкан фізічнага факультэта. Многія пытанні, што ставіла перад сабой ГНК БДУ, патрабавалі вялікай і карпатлівай работы на месцах. Выносіліся абгрунтаваныя рашэнні і рэкамендацыі, што садзейнічала выкараненню шэрагу недахопаў. Трэба адзначыць добрую работу ГНК фізфака. Яе старшыня Н. М. Хаўратовіч праявіла сябе ініцыятыўным кіраўніком, і група плённа вырашала надзённыя пытанні.

**П. І. Брыгадзін,** старшыня штаба «КП» БДУ. Нядаўна штаб «КП» і факультэцкія штабы праверылі стан вучэбных аўдыторый і інвентару універсітэцкіх карпусоў. Выяўлена шмат недахопаў. У актавай зале філфака каля 10 паламаных крэслаў. Сталы амаль ва ўсіх аўдыторыях брудныя. Студэнты пішуць на іх не толькі ручкамі, але і больш вострымі прадметамі.

На журфаку ў аўдыторыі 43-й палавіна сталоў брудныя. Тая ж карціна ў 309, 311, 501 аўдыторыях хімфака, 428, 430, 423 — матфака. Такія прыклады можна знайсці і на іншых факультэтах. Каб выправіць становішча, многія камсамольскія арганізацыі распрацавалі шэраг мерапрыемстваў, аднак тут камсамольцам не абысціся без дапамогі груп народнага кантролю.

Больш актыўна трэба выкарыстоўваць старонкі шматтыражнай газеты, часцей публікаваць заметкі аб рабоце народных кантралёраў.

**А. С. Бурак,** намеснік загадчыка аддзела аргработы КНК БССР. Універсітэцкая група народнага кантролю правяла пэўную работу. Старшыня ГНК Я. М. Тагуноў даволі поўна расказаў пра яе дзейнасць. Уноў выбранай групе трэба будзе больш увагі звяртаць на арганізацыю вучэбнага працэсу, матэрыяльнае яго забеспячэнне, навуковую дзейнасць калектыву універсітэта.

* * *

Адбылося першае арганізацыйнае пасяджэнне універсітэцкай групы народнага кантролю. Старшынёй групы выбран дацэнт юрфака **Я. М. Тагуноў,** намеснікамі **А. А. Акінчыц,** асістэнт хімфака, і **А. Д. Андрэеў,** дацэнт фізфака.

Кіраўнікамі сектараў выбраны:

**Кірыла Л. Р.** — сектар вучэбнай работы;

**Сакалоў М. А.** — сектар навуковай работы;

**Кніга М. В.** — сектар быту;

**Галаваты І. В.** — сектар па ахове сацыялістычнай маёмасці;

**Юхо І. А.**—сектар заяў і скарг.

# ЗАМАЛЁЎКІ З НАТУРЫ



**Ці то раніца, ці то вечар.**



**— Хто апошні!**

**— Ён у галоўным корпусе...**



**Цякуць рэкі рукатворныя...**




**Гэтыя дзверы ў душавой інтэрната на вул. Бабруйскай так і чакаюць моманту, каб зваліцца каму-небудзь на галаву. А раптам яны пакараюць не безгаспадарчых гаспадарнікаў, а невінаватага чалавека!**

Малюнкі Т. Засім.

# БУДНІ СТУДЭНЦКІЯ

● ФОТАРЭПАРТАЖ

## ЗАЗІРНІ Ў ГЛЫБІНЮ







Лесвіца нясе нас вышэй і вышэй — на сёмы паверх. дзе размясціліся аўдыторыі. кабінеты і лабараторыі біялагічнага факультэта.

Давайце заглянем у адну з аудыторый.

Кафедра фізіялогіі чалавека і жывёл... Невялікі, утульны пакой, уздоўж акон расстаўлены вазоны. На сталах — мноства розных прыбораў. прыстасаванняў. Ля іх схіліліся засяроджаныя юнакі і дзяўчаты у бялютkіх халатах. Час ад часу адрываюцца яны ад прыбораў, запісваюць у сшыткі разлікі. робяць паметкі на стужках - кардыяграмах.

— Тэма сённяшніх заняткаў чацвёртакурснікаў. — расказвае выкладчыца кафедры Антаніна Георгіеўна Сташонак. — фазавы аналіз работы сэрца жабы і змяненне электракардыяграфічных паказчыкаў пры эксперыментальным яго некрозе.

Гэта адна з тэм спецпрактыкума, цікавая, захапляючая. Студэнтам ёсць над чым паразважаць. ёсць матэрыял для нараджэння новых думак. смелых гіпотэз і здагадак.

Непрыкметна ляціць час. Студэнты пачынаюць ужо «чараваць» каля электракардыеграфа. Ідзе запіс работы сэрца іх «пацыёнткі». Антаніна Георгіеўна тлумачыць:

— Заўважце узровень крывых сісталы і дыясталы. А цяпер. — выкладчыца звяртаецца да Ларысы Булыгінай. — пакладзіце на сэрца кавалачак ляпісу. Бачыце — пауза стала больш працяглай...

На стужцы выпісваюцца новыя «сісталы». «паузы».

Званок абвяшчае перапынак. У самы раз цяпер пазнаёміцца з будучымі фізіёлагамі — пятай групай чацвёртага курса.

— Галоўная рыса нашага калектыву, — расказвае староста Лідзія Янушкевіч, — працавітасць. Адна трэць студэнтаў займаецца толькі на выдатна, удзельнічае у навуковай рабоце. Напрыклад. Валодзя Барай — сааўтар аспіранта Акадэміі навук Аляксандра Мілюціна. Летам на сімпозіуме беларускіх фізіёлагаў яны выступяць з навуковым дакладам.

...Заняткі падыходзяць к канцу. Вось ужо лабарантка папярэджвае. каб не затрымліваліся над разлікамі вопытаў.

— Зноў не хапае часу. — чуецца дзявочы голас.

— Не хапае часу. — усміхаецца Антаніна Георгіеўна. — Ды гэта ж цудоўна! Значыць. чалавек жыве паўнацэнным жыццём.

**В. СТЭЛЬМАХ.**
Фота аўтара.

**Уладзімір Барай — «вялікі» эксперыментатар.**

**Цікава. што наконт вопыту скажа выкладчыца Антаніна Георгіеўна?**

**У час заняткаў.**

## ЯГО ЦУДОЎНЫ СВЕТ

Шлях у фатаграфію ў Аляксандра Яроміна, студэнта III курса біялагічнага факультэта, пачаўся тры гады назад. Ён не памятае, як і адкуль з'явілася думка заняцца фатаграфіяй, памятае толькі, што за некалькі дзён перачытаў шмат кніг па гэтай справе, а затым купіў фотаапарат.

І адразу змяніўся навакольны свет. Саша стаў больш уважліва ўглядацца ў жыццё. Імкнуўся знаходзіць самае галоўнае, характэрнае для той ці іншай з'явы, убачыць незвычайнае, непаўторнае ў самым звычайным. Не адразу, вядома, усё атрымлівалася. Трэба было шмат назіраць, умець разважаць і аналізаваць.

У выхадны дзень, каб адпачыць ад бясконцай гарадской мітусні, Саша едзе дадому, у родную вёску. Там ён бярэ фотаапарат і ідзе ў лес. Ён увогуле любіць бываць адзін. Урачыстая цішыня лесу не перашкаджае думаць. Такія дні пралятаюць хутка-хутка, але пакідаюць мноства ўспамінаў.

Не толькі адпачынак бачыць Саша ў сваім захапленні. Ён — будучы настаўнік-біёлаг, якому патрэбны фотаздымкі прыроды, жывёл, птушак. Ну, хаця б для таго, каб цікава аформіць біялагічны кабінет. Яму не спатрэбяцца тады выразкі са старых часопісаў.

У размове Саша просты, шчыры, цікавы чалавек.

— Кожная фатаграфія — гэта невялічкая гісторыя, — расказвае хлопец. — Возьмеш яе ў рукі, і адразу ўсплывае, ў памяці кавалачак перажытага...

Гэтым летам Саша са сваімі сябрамі быў на практыцы ў вёсцы. Аднойчы гаспадыня запрасіла іх паспрабаваць агрэсту. Студэнты весела накінуліся на вялікі і густы куст, што чырванеў спелымі ягадамі. І раптам ля зямлі штосьці заціўкала. Саша хуценька расхінуў галіны і на самым карнявішчы ўбачыў гняздо, а ў ім некалькі пушыстых камочкаў — птушанят з разяўленымі роцікамі...

Так з'явілася фатаграфія «Птушаняты».

Не поўным будзе расказ пра Сашу, калі не ўспомніць фотаконкурс, які арганізаваў ён на сваім факультэце. Справа ў тым, што фатаграфаваннем на біяфаку займаюцца многія студэнты, але кожны сам па сабе, у адрыве ад жыцця факультэта. Хоць кажуць, што адзін у полі не воін, але Саша вырашыў паспрабаваць. Падыходзіў да аднаго, другога... Дзяліўся сваёй задумай. Спачатку адмахваліся, а потым усе «захварэлі» Сашынай ідэяй.

І фотаконкурс атрымаўся. А назвалі яго — «Свет такі цудоўны».

**У. ТАЛЯРОНАК.**

# ЭСТЭТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ

### АБ ГЭТЫМ ІШЛА ШМАТПЛАНАВАЯ РАЗМОВА НА ПАРТЫЙНЫМ СХОДЗЕ ГІСТАРЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА

Якое месца займаюць пытанні эстэтычнага выхавання ў фарміраванні гарманічна развітай асобы? Як выкарыстоўваюць кафедры і асобныя выкладчыкі свае магчымасці для выхавання ў студэнтаў пачуцця цудоўнага? Шляхі эстэтычнага выхавання і цяперашні яго ўзровень на курсах і ў групах і шмат іншых пытанняў было разгледжана ў дакладзе члена партбюро, кандыдата гістарычных навук Л. П. Максімавай.

Сходу папярэднічала вялікая падрыхтоўчая работа групы камуністаў, і таму быў зроблен прынцыповы аналіз стану эстэтычнага выхавання на факультэце, ускрыты недахопы, прыведзены красамоўныя факты і прыклады.

Свае задачы партыйная арганізацыя, увесь калектыў гістфака бачаць у тым, каб фарміраваць у студэнтаў эстэтычныя адносіны да рэчаіснасці, развіваць у іх правільны эстэтычны густ, змагацца супраць пранікнення ў студэнцкае асяроддзе варожых нам поглядаў, перайманне буржуазнай культуры і моды, выпрацоўваць сістэму марксісцка-ленінскіх эстэтычных ацэнак, абуджаць і развіваць творчыя здольнасці будучых спецыялістаў.

Многае робіцца ў гэтым плане на лекцыях па гістарычных дысцыплінах, пры чытанні спецкурсаў, у спецсемінарах і ў час практыкумаў па эстэтычнаму выхаванню.

Важны шлях — пазавучэбная, культурна - масавая работа. Аднак яна вядзецца яшчэ недастаткова мэтанакіравана і паслядоўна, часам абмяжоўваецца асобнымі мерапрыемствамі. Але ж тут можна чакаць больш разнастайнай і дзейснай працы партыйнай і грамадскіх арганізацый факультэта. Аднак у комплексным плане камсамольскай арганізацыі «Вучыцца камунізму» і ў праграме Ленінскага ўрока «Вучыцца, жыць і працаваць па Леніну» няма і слова аб задачах эстэтычнага выхавання, аб неабходнасці павышаць культуру студэнтаў.

Цэнтр такой працы звычайна — акадэмічная група. Менавіта ў ёй ствараецца рэальная магчымасць найбольш эфектыўнага ўздзеяння на кожнага студэнта з боку выкладчыка і камсамольскай арганізацыі. Аднак, як паказалі вынікі праверкі, у групах не вельмі знаходліва вядзецца эстэтычнае выхаванне. Аднатыпна будуецца гэта работа і на першым, і на пятым курсах, без уліку ўжо дасягнутага ўзроўню, стандартнымі сродкамі.

Рыхтуючыся да сходу, камісія глыбока прааналізавала планы палітыка - выхаваўчай работы груп, курсаў. Цікавіла пытанне, наколькі эфектыўна выкарыстоўваецца мастацтва ў выхаваўчых мэтах. З дапамогай выкладчыкаў было праведзена невялікае сацыялагічнае даследаванне сярод студэнтаў I, III, IV курсаў аддзяленняў гісторыі і палітэканоміі. Вынікі прадстаўляюць пэўны інтарэс і паказваюць, што мастацтва ўсё больш і больш уваходзіць у жыццё студэнцкай моладзі. Але было прыкмечана, што студэнты ўсё ж недастаткова далучаюцца да тэатральнага мастацтва, рэдка бываюць у тэатрах, асабліва ў оперным. Ёсць студэнты, якія на працягу некалькіх год не чулі opернай музыкі.

Студэнты факультэта не сустракаюцца з тэатральнымі калектывамі і асобнымі вядучымі акцёрамі, не абмяркоўваюць тэатральныя пастаноўкі. Рэдкія госці яны ў Мастацкім музеі, Палацы мастацтваў. На III курсе толькі 10 працэнтаў студэнтаў рэгулярна наведваюць музеі. Прыкладна 40 працэнтаў трэцякурснікаў не бываюць на сімфанічных канцэртах, затое на эстрадных гэты паказчык узрастае да 78, а сярод першакурснікаў—амаль да 100.

Яшчэ не ўсе студэнты адчуваюць унутраную патрэбу далучэння да мастацтва. Невыпадкова на пытанне «Што перашкаджае часцей глядзець, слухаць і чытаць творы мастацтва ў свабодны час», некаторыя адказалі: «Адсутнасць жадання». «Няўменне арганізаваць свой асабісты час» — так адказалі 53 працэнты першакурснікаў і 30 — студэнтаў III курса.

Многія юнакі і дзяўчаты прыехалі ў БДУ з аддаленых сельскіх мясцовасцей. Па некаторых прычынах яны не мелі магчымасці далучыцца да такіх відаў мастацтва, як музыка, опернае, выяўленчае мастацтва. І вельмі прыкра будзе, калі яны, правёўшы пяць год ва універсітэце, вернуцца ў родныя мясціны, не выкарыстаўшы багатых магчымасцей нашай сталіцы — буйнога культурнага цэнтра краіны.

Мы нецярпіма адносімся да непаспяваючых, парушальнікаў дысцыпліны, ведаем, хто як вучыцца. А як адпачывае студэнт, чым займаецца ў вольны час, сказаць часам не можам. Вельмі рэдка ў групах вядуць сур'ёзную размову аб рацыянальным выкарыстанні часу, аб інтарэсах таго ці іншага студэнта.

Важную ролю ў развіцці пачуцця цудоўнага адыгрывае мастацкая самадзейнасць. Добрай традыцыяй сталі міжфакультэцкія агляды-конкурсы.

У многім вызначаюць увесь стыль жыцця універсітэта нашы ўрачыстыя, традыцыйныя мерапрыемствы — пасвячэнне ў студэнты, апошні званок, вечары, прысвечаныя юбілейным датам. Асноўны недахоп гэтых урачыстасцей —адсутнасць на іх большасці куратараў, выкладчыкаў.

Адзін са шляхоў эстэтычнага выхавання — стварэнне адпаведнага эстэтычнага акружэння. Бо кожная дэталь вузаўскага інтэр'ера так або інакш уплывае на студэнта. Па-мастацку афармленыя вестыбюлі, пляцоўкі паміж калідорамі, аўдыторыі, кабінеты павінны ствараць пэўны псіхалагічны настрой. У Вільнюскім універсітэце, напрыклад, у малой актавай зале, аўдыторыях стаяць кніжныя шафы, у якіх сабраны творы буйнейшых мысліцеляў свету, скульптурныя фігуры выдатных людзей навукі і мастацтва, карціны і пано, якія звязаны з духоўным жыццём народа і гісторыяй яго укльтуры. Ужо толькі знаходжанне ў такой атмасферы з'яўляецца вельмі дзейсным выхаваўчым фактарам.

На гістфаку ж калі і ёсць адбіткі выдатных скульптурных твораў, то яны ў большасці захоўваюцца пад замком у музеі.

Вельмі важна стварыць атмасферу нецярпімасці да безгустоўнасці, у чым бы яна ні праяўлялася. Многае тут абумоўліваецца ўзроўнем эстэтычнай культуры выкладчыка.

Неабходна ўлічваць і такі фактар, як эстэтыка быту. У некаторых вну пастаянна праводзяцца рэйды па інтэрнатах пад дэвізам «Эстэтыка і быт». Такі рэйд пад кіраўніцтвам дацэнта Я. В. Петушковай быў праведзен і ў інтэрнаце гісторыкаў. Што кінулася ў вочы? Дзіўна, але факт, што на самым відным месцы ў ленпакоі вісіць маляўнічы інвентарны вопіс, які, безумоўна, не адносіцца да элементаў эстэтычнага афармлення.

Удзельнікі рэйду звярнулі таксама ўвагу на тое, што ў інтэрнаце няма вазонаў ні ў ленінскім пакоі, ні ў чытальнай зале, ні ў студэнцкіх пакоях. Не мае эстэтычнага афармлення і вестыбюль. Склалася ўражанне, што эстэтыка ўкараняецца ў быт інтэрната толькі ў межах санітарыі і гігіены.

Выказана было меркаванне, што пры правядзенні конкурсу на лепшы пакой трэба ўлічваць і яго эстэтычнае афармленне.

У інтэрнаце неабходна арганізоўваць сустрэчы, гутаркі з мастакамі, архітэктарамі аб тым, як ствараць сучасны інтэр'ер, як зрабіць свой пакой прыгожым. Вялікую ж цікавасць выклікаюць сустрэчы з супрацоўнікамі Дома мадэлей.

Неабходна звяртаць увагу і на знешні выгляд нашых студэнтаў. Многія ходзяць неахайна апранутымі, з доўгімі валасамі. Часам дзяўчаты праз меру карыстаюцца касметыкай, вульгарна паводзяць сябе.

Тут трэба ўлічваць два моманты. Бывае, добрыя ў маральных адносінах юнакі мала або зусім не звяртаюць увагі на свой знешні выгляд. Яны разважаюць прыкладна так: навошта мне прыгожыя манеры, я ж не граф. Ёсць і такія «эстэты», у якіх пад модным відам хаваюцца чужыя нам дробнабуржуазныя погляды і мяшчанскія густы. Эгаістычнасць, душэўная нікчэмнасць—якраз тыя маральныя якасці, з якімі мы павінны весці бескампрамісную барацьбу.

Важна выхоўваць нецярпімасць да недахопаў. Карыснымі былі б сходы менавіта па культуры паводзін студэнтаў.

Наспела неабходнасць пераходзіць ад асобных эстэтычных мерапрыемстваў к сістэме эстэтычнага выхавання, забяспечыць яго планамернасць на працягу ўсіх год вучобы.

У многіх вну створаны і паспяхова працуюць своеасаблівыя каардынуючыя цэнтры ўсёй выхаваўча-эстэтычнай работы, куды ўваходзяць члены камітэтаў камсамола, грамадскіх арганізацый, адказныя за культурна - масавую работу, кіраўнікі мастацкай самадзейнасці, актывісты - студэнты. Узначальваюць такія саветы, як правіла, выкладчыкі эстэтыкі.

Стварэнне сістэмы эстэтычнага выхавання — задача вельмі складаная, але яна можа быць вырашана агульнымі намаганнямі.

**АД РЭДАКЦЫІ. Партбюро гістфака праявіла вельмі каштоўную ініцыятыву, правёўшы сход, прысвечаны эстэтычнаму выхаванню. Паколькі адзначаныя ў публікуемым матэрыяле недахопы характэрны і для іншых факультэтаў, рэдакцыя спадзяецца, што пачатая важная размова будзе мець працяг.**

# КАЛЯНДАР ЗНАМЯНАЛЬНЫХ ДАТ

**14 студзеня** — 150 год з дня нараджэння В. В. Стасава (1824—1906), рускага мастацкага і музычнага крытыка.

**22 студзеня 1905 г.**—Расстрэл царскімі войскамі мірнай дэманстрацыі рабочых у Пецярбургу (Крывавая нядзеля). Барыкады ў сталіцы. Пачатак першай рускай рэвалюцыі.

**22 студзеня** — 70 лет з дня нараджэння А. П. Гайдара (Голікава) (1904—1941), савецкага пісьменніка.

**23 студзеня** — 50 год назад (1924) піянерскай арганізацыі было прысвоена імя У. І. Леніна.

**25 студзеня** — 25 год назад (1949) было апублікавана паведамленне аб утварэнні Савета Эканамічнай Узаемадапамогі (СЭУ).

**26 студзеня** — 40 год з дня адкрыцця (1934) XVII з'езда ВКП (б).

**26 студзеня** — 125 год з дня нараджэння П. А. Аляксеева (1849—1891), рускага рабочага-рэвалюцыянера.

**27 студзеня**—15 год з дня адкрыцця (1959) нечарговага XXI з'езда КПСС.

**27 студзеня** — 30 год з дня (1944) поўнага вызвалення Ленінграда ад варожай блакады.

**31 студзеня** — 50 год назад (1924) II з'езд Саветаў СССР зацвердзіў першую Канстытуцыю СССР.

**31 студзеня** — 50 год назад (1924) Пленум ЦК РКП (б) прыняў рашэнне аб правядзенні ленінскага прызыву ў партыю.

50 год назад у студзені 1924 года выйшаў у свет першы нумар часопіса «Смена».

# МАЛАЙЦЫ!

— І ў гэтых спаборніцтвах абавязкова зоймем першае месца, — гаворыць член зборнай каманды па баскетболу С. Кудлаеў.

Заяўлена гэта не без падставы. Вось ужо 14 разоў каманда фізфака прымае ўдзел у першынстве універсітэта па баскетболу. І заўжды іх гульня прыносіць гледачам захапленне, а камандзе — першае месца.

Хто ж абараняе спартыўны гонар факультэта? А. Малышаў — былы капітан зборнай юнакоў БССР, а зараз зборнай БДУ. Гэта тэхнічны, хуткі спартсмен. Усе тактычныя завязкі на пляцоўцы—яго справа.

У абароне вылучаецца С. Кудлаеў, інжынер лабараторыі ядзернай электронікі. А кандыдат фізіка-матэматычных навук С. Чаранкевіч — ветэран каманды. Ён адстойвае спартыўны гонар фізфака ўжо 12 гадоў. Дарэчы, займацца баскетболам пачаў толькі ва універсітэце, а зараз мае І спартыўны разрад. Сярод мацнейшых В. Тоўсцік, М. Ліфшыц, А. Кандрашоў.

— Каманда гуляе на высокіх скорасцях, з добрым узаемаразуменнем, —гаворыць трэнер зборнай універсітэта па баскетболу, галоўны суддзя спаборніцтваў Г. М. Грудо.—І калі б ім прыйшлося ўдзельнічаць у першынстве горада сярод вну, думаю, яны б занялі прызавое месца. Трэба адзначыць, што асноўны касцяк зборнай універсітэта складаецца з баскетбалістаў фізфака.

У іх не ўзнікае пытанне, ці перашкаджае спорт вучобе, рабоце. А. Малышаў, напрыклад, на працягу ўсіх студэнцкіх год быў выдатнікам, С. Чаранкевіч нядаўна абараніў дысертацыю.

**Т. НЕЎПАКОЕВА.**



## «ЗДАРОЎЕ» НАБІРАЕ ТЭМПЫ

Спартакіяда «Здароўе» праводзіцца сярод выкладчыкаў і супрацоўнікаў нашага універсітэта.

— Мэта яе — падружыць з фізічнай культурай і спортам людзей розных узростаў. У праграме спартакіяды 12 відаў спорту: валейбол, баскетбол, гандбол, плаванне, рыбная лоўля, лёгкая атлетыка і г. д., — расказвае старшыня спортклуба Уладзімір Цітарук.

У спаборніцтвах прымаюць удзел каманды ўсіх факультэтаў, а таксама асобныя кафедры, напрыклад, кафедры фізічнага выхавання, палітэканоміі і іншыя.

Больш паспяхова выступаюць каманды факультэтаў — фізічнага і прыкладной матэматыкі. Яны ўпэўнена трымаюць лідэрства.

Цяпер ідуць спаборніцтвы па валейболу і лыжнаму спорту.

**І. ВІКТАРАЎ.**
(Карпункт прафкома).

## ФІНАЛІСТЫ ВЯДОМЫ

**Барацьба за выхад у фінал сярод мужчынскіх і жаночых каманд нашага універсітэта па баскетболу разгарэлася з першых гульняў. У дзвюх падгрупах спаборнічалі па пяць каманд. Акрамя гэтага, у другой, мужчынскай падгрупе, па-за конкурсам выступалі спартсмены факультэта па навучанню замежных студэнтаў.**

**Усе без выключэння гульні праходзілі па-спартыўнаму востра і цікава. Даволі хутка выявіліся і мацнейшыя. У мужчын — каманды матэматычнага, хімічнага, фізічнага і юрыдычнага факультэтаў, а ў жанчын — факультэтаў прыкладной матэматыкі, хімічнага, гістарычнага і філалагічнага. Усе гэтыя каманды і разыграюць I—IV месцы ў сакавіку 1974 года.**

**Трэба адзначыць выдатную падрыхтоўку спартсменаў філфака. А сёміразовы чэмпіён — каманда геаграфічнага факультэта — знята са спаборніцтва з-за нез'яўлення на гульню.**

**І. СЦЯПАНАЎ.**

# ТРАДЫЦЫЙНЫ «РУСКІ ЧАЙ»

ЗАЛІТА святлом упрыгожаная актавая зала інтэрната № 7. Ідуць апошнія падрыхтаванні да вечара «Рускі чай». Сервіроўку сталоў своеасабліва дапаўняюць самавары.

На гэты вечар, арганізаваны кафедрай рускай мовы падрыхтоўчага факультэта для замежных грамадзян, былі запрошаны першакурснікі з Сенегала, Конга, Кубы, В'етнама, стажоры-філолагі з Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі. Пропускам сюды былі рускія прыказкі. І таму: «Век жыві —век вучыся», «Малы залатнік, ды дарагі», «Не плюй у калодзеж — спатрэбіцца вады напіцца», — старанна, з лёгкім акцэнтам вымаўляюць госці.

Праграма вечара вельмі насычаная і цікавая. Арганізатары «Рускага чаю» выкладчыкі рускай мовы Любоў Сямёнаўна Халімановіч, Уладзімір Георгіевіч Будай, Аляксандра Віктараўна Куцэнка, Зінаіда Лукінічна Коласава паклапаціліся, каб было па-святочнаму весела, не змаўкалі песні і жарты.

Спачатку студэнты пазнаёміліся з традыцыямі чаяпіцця ў розных краінах, з гісторыяй паяўлення чаю на Русі. А затым гаспадыня — Л. С. Халімановіч запрасіла ўсіх на шклянку чаю. Як гаворыцца, «чай піць — не дровы рубіць».

У зале загучалі «Падмаскоўныя вечары», задорны «Казачок», беларускія «Рушнікі», украінская народная песня «Зелен клён», «Гімн дэмакратычнай моладзі». Ім на змену прыходзілі выступленні салістаў.

А потым паўнапраўнай гаспадыняй свята стала паэзія. Студэнты чыталі вершы Лермантава, Маякоўскага, Сіманава, Маршака і іншых паэтаў. Першы прыз за чытанне ўрыўка з паэмы Маякоўскага «Уладзімір Ільіч Ленін» быў прысуджан Ханне-Лорэ Бенц з ГДР, будучай выкладчыцы рускай мовы. Вельмі цёпла быў успрынят верш «Руская мова», які з хваляваннем прачытаў студэнт І курса хімфака Помпа Жорж з Конга.

Са сваімі жартоўнымі нумарамі выступілі «Вясёлыя лінгвісты» з ГДР, студэнты з Кубы. У конкурсе «Рамонак» госці мелі магчымасць паказаць веданне рускай мовы. І адказы давалі даволі грунтоўныя.

Затым на сцэне з'явіўся вялікі маг і чараўнік, доктар усіх навук Суфікс Прэфіксавіч Фанетык дэ Глагол фон Палігнот (У. Г. Будай). І сапраўды, ён ведаў і ўмеў усё. Вялікі чараўнік мог паказаць не толькі фокусы, але і зарэкамендаваў сябе добрым знаўцам рускай мовы.

Атмасфера шчырасці, узаемаразумення, гумару, напаўняла, застанецца ў памяці ўсіх удзельнікаў гэтага цудоўнага вечара сяброўства прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей.

**В. УСЦЮЖАНІН,**
**М. КАЗЕЙКА,**
**студэнты.**





□

**Госці ў ролі гаспадынь.**

**Задорны танец «Казачок» прынёс перамогу ў конкурсе стажорам III і IV груп з ГДР.**

**Фота У. БУДАЯ.**

□

# АГЕНЬЧЫК БРАТЭРСТВА

На падрыхтоўчым факультэце для замежных студэнтаў прайшоў «Блакітны агеньчык». Вечар адкрыла выкладчыца факультэта З. Я. Какошнікава. Яна адзначыла вялікі ўклад Камуністычнай партыі Савецкага Саюза ў аздараўленне міжнароднага становішча, расказала пра выдатныя падзеі прайшоўшага 1973 года.

А затым традыцыйныя Дзед Мароз і Снягурачка горача віталі замежных сяброў. Да іх віншаванняў далучыліся замежныя студэнты з многіх краін свету, якія прыйшлі на вечар у нацыянальных касцюмах і выступілі з цікавай канцэртнай праграмай. З вялікай цеплынёй было сустрэта выступленне танцавальнага калектыву «Крыжачок» і хору выкладчыкаў факультэта.

**В. КАЛАДЗІНСКІ.**

## НОВЫЯ КНІГІ

**па геолага - геаграфічных навуках, якія паступілі ў бібліятэку БДУ ў снежні.**

1. Вопросы режима и исследования озер и водохранилищ. Под ред. канд. техн. наук В. А. Знаменского. Л., Гидрометеоиздат, 1973.
2. Зайков, Б. Д. Очерки гидрологических исследований в России. Л., Гидрометеоиздат, 1973.
3. Марков, С. Н. Вечные следы. Книга о землепроходцах и мореходах. М., «Мол. гвардия», 1973.
4. Пальмен, Э. и Ньютон, Ч. Циркуляционные системы атмосферы. Пер. с англ. Л., Гидрометеоиздат, 1973.
5. Проблемы регулирования и использования водных ресурсов. М., «Наука», 1973.
6. Радиометрическое датирование. Сборник статей. Пер. с англ. Под ред. чл.-кор. АН СССР А. И. Тугаринова. М., Атомиздат, 1973.
7. Строение земной коры и верхней мантии морей и океанов. Сборник статей. М., «Наука», 1973.
8. Физика пограничного слоя атмосферы. Сборник статей. Л., Гидрометеоиздат, 1973.
9. Филонец, П. П. и Омаров, Т. Р. Озера Центрального и Южного Казахстана. Справочник. Алма-Ата, «Наука», 1973.
10. Численные методы прогноза и анализа атмосферных процессов. Л., Гидрометеоиздат, 1973.

## ШТО Ж ТАКОЕ ГРЫП?

*ПАРАДЫ ЎРАЧА*

Грып амаль кожны год прыносіць шмат клопатаў, але да яго дагэтуль захаваліся несур'ёзныя адносіны: «Грып... ды нічога страшнага, пройдзе».

Што ж такое грып? Гэта інфекцыйнае захворванне віруснага паходжання. Хвароба пачынаецца востра, тэмпература падымаецца высокая ўжо ў першы дзень.

Трэба падкрэсліць, што пры грыпе амаль заўсёды паражаюцца дыхальныя шляхі, і таму хворых турбуюць кашаль, болі за грудзінай, насмарк або закладванне носа.

Хворыя адчуваюць рэзкі галаўны боль, мышачныя болі, агульную слабасць, калі-нікалі бывае галавакружэнне і нават стан непрытомнасці.

Агульная слабасць пры грыпе трымаецца даволі доўга. Гэта тлумачыцца тым, што вірусы грыпа пранікаюць у кроў. Іменна таму нярэдка бываюць ускладненні з боку нервовай і сардэчна-сасудзістай сістэм.

Калі грып працякае без ускладненняў, то хвароба праходзіць праз 3—5 дзён, але трэба помніць, што паніжэнне тэмпературы не азначае заканчэння хваробы. Своеасаблівасць гэтай інфекцыі ў тым, што ўскладненні з'яўляюцца рана, калі-нікалі з першых часоў захворвання. Найбольш складаныя з іх— запаленне лёгкіх. Нярэдка развіваюцца вострыя бранхіты, аціты, ангіна, гаймарыты, франціты або абвастраюцца хранічныя бронхагенныя працэсы.

Як павінен весці сябе хворы грыпам? Перш за ўсё — дапамагаць арганізму змагацца з інфекцыяй. Для гэтага трэба захоўваць сілы і прытрымлівацца пасцельнага рэжыму.

Не трэба ісці ў паліклініку, а неабходна выклікаць урача на дом. Стамленне, звязанае з дарогай, ахаладжэнне, зніжаюць супраціўленне арганізма, і ў гэтых умовах лягчэй развіваецца ўскладненне.

Для лячэння гэтага інфекцыйнага захворвання выкарыстоўваюцца розныя лекавыя сродкі. Але прымаць медыкаменты без рэцэпта ўрача нельга, таму што можна сабе пашкодзіць.

Увядзенне супрацьгрыпавых сываратак дазваляе значна панізіць захворванне грыпам.

Вакцына бясшкодная і прыносіць толькі карысць.

Важнае значэнне маюць асабістая гігіена, вільготная ўборка памяшкання, праветрыванне. Не трэба пераахалоджвацца. Карысна загартоўваць сябе рознымі воднымі працэдурамі, больш бываць на свежым паветры.

Грып — гэта захворванне, якое патрабуе да сябе сур'ёзных адносін як медыцынскіх работнікаў, так і ўсяго насельніцтва.

**М. ЦЫРУЛЬНІКАВА,**
**урач.**

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

«Белорусский университет»—орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Тыраж 2000 экз.
Газета выходзіць па чацвяргах.
Аб'ём—1 друк. ар.

Наш адрас: г. Мінск. Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
АТ 05014
Зак. 02.